Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б
і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 257 (326)
АЎТОРАК
5
ЛІСТАПАДА
1940 г.

Цана 10 капеек.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР

АБ ПАРАДКУ ПРЫМЯНЕННЯ АРТЫКУЛА 69 «ПАЛАЖЭННЯ АБ ВЫБАРАХ У АБЛАСНЫЯ, РАЁННЫЯ, ГАРАДСКІЯ, СЕЛЬСКІЯ І ПАСЯЛКОВЫЯ СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ БССР» ПРЫ ВЫСТАЎЛЕННІ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ МЯСЦОВЫХ СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ БССР У СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЦЯХ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Устанавіць, што права выстаўлення кандыдатаў у дэпутаты абласных, раённых, гарадскіх, сельскіх і пасялковых Советаў дэпутатаў працоўных у сельскіх мясцовасцях заходніх абласцей Беларускай ССР ажыццяўляюць, побач з рэспубліканскімі, абласнымі і раённымі органамі грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных,—агульныя сходы сялян па сельскіх Советах і вёсках.

1 лістапада 1940 г.
г. Мінск.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

Лозунгі ЦК ВКП (б)
ДА XXIII ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

1. Няхай жыве XXIII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР!

2. Братам па класу, вязням капітала, барацьбітам за вызваленне рабочага класа ва ўсім свеце—наша брацкае прывітанне!

3. Умацуем інтэрнацыянальныя сувязі рабочага класа СССР з рабочым класам капіталістычных краін! Вышэй сцяг міжнароднай пролетарскай салідарнасці!

4. Няхай жыве знешняя палітыка Совецкага ўрада, палітыка міру паміж народамі і забеспячэння безапаснасці нашай радзімы!

5. Няхай жыве наша родная Чырвоная Армія—магутны аплот мірнай працы народаў СССР, верны страж заваёў Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі!

6. Працоўныя Совецкага Саюза! Не забывайце аб капіталістычным акружэнні! Будзем няўхільна ўмацоўваць нашу Чырвоную Армію і нашу соцыялістычную разведку—ВЧК!

7. Няхай жыве Ваенна-Марскі Флот Совецкага Саюза—надзейная ахова совецкіх марскіх граніц!

8. Няхай жыве магутная совецкая авіяцыя! Няхай жывуць совецкія лётчыкі—гордыя сокалы нашай радзімы!

9. Прывітанне мужным і бясстрашным байцам-пагранічнікам, зоркім часавым краіны соцыялізма!

10. Прывітанне працоўным Літвы, Латвіі, Эстоніі, Бесарабіі, Паўночнай Букавіны, будуючым сваё свабоднае жыццё ў вялікай брацкай сям'і народаў Совецкага Саюза.

11. Няхай жыве Саюзная Малдаўская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!

12. Няхай жыве Саюзная Літоўская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!

13. Няхай жыве Саюзная Латвійская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!

14. Няхай жыве Саюзная Эстонская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка!

15. Няхай жыве брацкі саюз і дружба народаў Совецкага Саюза!

16. Стаханаўцам прамысловасці, транспарта, гандлю і сельскай гаспадаркі, знатным людзям нашай краіны—большэвіцкае прывітанне!

17. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі чорнай і каляровай металургіі! Змагайцеся за павелічэнне вытворчасці металу, за яго якасць!

18. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі машынабудаўнічай прамысловасці! Змагайцеся за развіццё самага передавога ў свеце машынабудаўніцтва!

19. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі абароннай прамысловасці! Мацуйце абаронную магутнасць нашай радзімы! Узбройвайце Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот навейшай тэхнікай!

20. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі паліўнай і энергетычнай прамысловасці! Большэвіцкімі тэмпамі рухайце ўперад здабычу паліва і вытворчасць электраэнергіі! Умацоўвайце паліўную і энергетычную базу СССР!

21. Работнікі хімічнай прамысловасці! Змагайцеся за стварэнне магутнай хімічнай прамысловасці нашай краіны!

22. Таварышы будаўнікі! Змагайцеся за паскарэнне тэмпаў будаўніцтва, за патаненне і высокую якасць будоўляў!

23. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці! Больш паркалю, шоўку, сукна, трыкатажу, абутку, вопраткі для грамадзян совецкай краіны! Змагайцеся за высокую якасць прадукцыі!

24. Створым магутныя дзяржаўныя працоўныя рэзервы для прамысловасці і транспарта!

25. Калгасная і гарадская моладзь! Ідзіце ў школы фабрычна-заводскага абучэння, рамесляныя і чыгуначныя вучылішчы! Рыхтуйцеся стаць кваліфікаванымі работнікамі нашай радзімы!

26. Барацьба з прагульшчыкамі і дэзарганізатарамі вытворчасці ёсць барацьба за ўмацаванне магутнасці нашай радзімы і яе Чырвонай Арміі. Няхай жывуць працоўная дысцыпліна і ўзорны парадак на прадпрыемствах нашай радзімы!

27. Калгаснікі і калгасніцы! Змагайцеся за высокія ўраджаі і ўздым грамадскай жывёлагадоўлі! Умацоўвайце грамадскую гаспадарку калгасаў! Няхай жыве заможнае і культурнае жыццё калгасаў!

28. Служачыя совецкіх устаноў! Змагайцеся за ўмацаванне дзяржаўнай дысцыпліны, за дакладнае выкананне совецкіх законаў!

29. Работнікі дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю! Змагайцеся за лепшае абслугоўванне совецкага спажыўца, за культурны совецкі гандаль у горадзе і вёсцы!

30. За далейшы росквіт соцыялістычнай культуры народаў СССР, за новыя поспехі і заваёвы совецкай навукі, тэхнікі, мастацтва!

31. Няхай жыве роўнапраўная жанчына Совецкага Саюза — актыўная ўдзельніца ў кіраванні дзяржавай, гаспадарчымі і культурнымі справамі нашай краіны!

32. Выхаванне ўсёй масы членаў профсаюзаў у духу ленінізма — пачотны доўг совецкіх профсаюзных арганізацый! Няхай жывуць совецкія профсаюзы — школа комунізма!

33. Разгорнем крытыку нашых недахопаў. Умацуем яшчэ больш магутнасць і арганізаванасць нашай дзяржавы!

34. Няхай жыве комсамол — верны памочнік большэвіцкай партыі! Няхай жыве совецкая моладзь—будучыня нашай радзімы!

35. Навучаючыяся совецкай школы! Авалодвайце навукай, рыхтуйцеся стаць барацьбітамі за справу Леніна—Сталіна!

36. Няхай жыве і мацнее наша магутная радзіма — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

37. Няхай жыве наш рабочы клас!

38. Няхай жыве наша калгаснае сялянства!

39. Няхай жыве наша, совецкая, інтэлігенцыя!

40. Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя большэвікоў—перадавы атрад працоўных Совецкага Саюза!

41. Няхай жыве Комуністычны Інтэрнацыянал — арганізатар барацьбы за перамогу працоўных!

42. Няхай жыве вялікі непераможны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна! Няхай жыве ленінізм!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў).

Масква, Крэмль.

ПРАВАДЫРУ НАРОДАЎ--ЛЮБІМАМУ СТАЛІНУ

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

Перадвыбарчая нарада прадстаўнікоў прадпрыемстваў Чырвонаармейскай выбарчай акругі горада Беластока, сабраўшыся на сход па абмеркаванню і вылучэнню кандыдатаў ў дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных першае сваё слова звяртае да Вас, вялікага прадаўжальніка справы Маркса—Энгельса — Леніна, творца самай дэмакратычнай у свеце канстытуцыі, вызваліцеля Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Дарагі таварыш СТАЛІН! Пад Вашым мудрым кіраўніцтвам вызваленыя народы заходніх абласцей Беларусі паспяхова будуюць новае жыццё. Назаўсёды ліквідавана беспрацоўе. З'яднаныя ў адзіную сям'ю вялікага народа Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, мы атрымалі свабоду, атрымалі права на працу, на асвету, на адпачынак.

Разам з усімі грамадзянамі вялікай Краіны соцыялізма не адчуваем мы тых жудасцей вайны, якой ахвачан увесь капіталістычны свет. Народы нашай краіны атрымліваюць усё новыя і новыя перамогі на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва.

Мы, прадстаўнікі Чырвонаармейскай выбарчай акругі, ў адказ на Вашы клопаты аб нас абавязуемся дастойна сустрэць дзень выбараў у мясцовыя Советы — 15 снежня 1940 года. Яшчэ вышэй узнімем прадукцыйнасць працы на фабрыках і заводах, будзем памнажаць рады стаханаўцаў, яшчэ вышэй узнімем палітычную актыўнасць працоўных у выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы, аддадзім свае галасы за лепшых сыноў народа, за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Пад сцягам партыі Леніна — Сталіна на выбарах у мясцовыя Советы прадэманструем свае сілы, сваю гатоўнасць усямерна мацаваць і абараняць нашу соцыялістычную радзіму, яшчэ вышэй узнімем класавую пільнасць.

Няхай жыве непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных на прадстаячых выбарах!

Няхай жыве наш мудры правадыр і настаўнік тав. СТАЛІН!

НА ПЕРАДВЫБАРЧАЙ НАРАДЗЕ ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ

Людна і ажыўлена ў зале пединстытута. Сюды прышлі ўпаўнаважаныя 2-й выбарчай акругі, перадавікі вытворчасці, стаханаўцы 2-га камбіната, 15-й тэкстыльнай фабрыкі, фанернага завода і іншых прадпрыемстваў. У гэтай акрузе вылучаецца кандыдатам у абласны Совет дэпутатаў працоўных Іван Вікенц'евіч Ражноўскі, старшыня беластоцкага торвыканкома.

Тав. Ражноўскі — верны сын працоўнага народа і большэвіцкай партыі, членам якой ён з'яўляецца з 1921 года.

— Калі тав. Ражноўскаму было 14 год, яго ўжо эксплаатавалі на наёмнай рабоце. Ён вышаў з народа, служыў народу і таму народ правільна яго вылучае, — гаворыць упаўнаважаны 15-й фабрыкі тав. Завадскі.

— Тав. Ражноўскі, па першае,—рабочы, па другое — комуніст, а затым — актыўны дзяржаўны совецкі дзеяч, які робіць усё, каб наш горад ператварыць у квітнеючы, соцыялістычны, — заяўляе стаханавец фанернага завода тав. Здравасмыслаў.

Жыццёвы шлях тав. Ражноўскага, расказаны ім самім, — гэта жывая ілюстрацыя таго,, як вырастаюць людзі з народнай гушчы. Сын беззямельнага селяніна вёскі Маслюкоўшчына, Віцебскай губерні, прайшоўшы цяжкі жыццёвы шлях муляра, батрака, рабочага возчыка, выхаван партыяй і вылучан на адказную работу.

— Я заўсёды чэсна выконваў даручэнні нашай партыі, аддана працаваў на дабро народа на тым участку, на які мяне ставіла партыя. Дзякую за давер'е. Я зраблю ўсё, каб апраўдаць давер'е народа—гаворыць тав. Ражноўскі.

Акруговы перадвыбарчы сход аднадушна падтрымаў кандыдатуру т. Ражноўскага і звярнуўся з заклікам да ўсіх выбаршчыкаў Чырвонаармейскай акругі галасаваць за кандыдатуру тав. Ражноўскага.

З велізарным энтузіязмам прысутныя прынялі прывітальнае пісьмо правадыру народаў таварышу Сталіну.

На перадвыбарчай нарадзе Ленінскай выбарчай акругі

Учора ў Доме партыйнай асветы адбылася нарада Ленінскай выбарчай акругі па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных.

Адкрываючы нараду, тав. Петрак гаворыць аб вялікіх перамогах, дасягнутых пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, аб велізарным росквіце совецкага дэмакратызма.

Пасля выбрання пачотнага прэзідыума нарада заслухала даклад студэнта пединстытута тав. Аб'езчыкава. Дакладчык расказаў біяграфію кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных Генрыха Фларэнцінавіча Ферэнцовіча. Тав. Ферэнцовіч з'яўляецца сапраўдным прадстаўніком працоўнай інтэлігенцыі. Яго вельмі паважаюць студэнты і выкладчыкі інстытута за яго адданасць. Тав. Ферэнцовіч увесь час прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце інстытута і з'яўляецца адным з лепшых навуковых супрацоўнікаў.

Затым пачаліся выступленні. Адзін за другім выступаюць прадстаўнікі прадпрыемстваў Ленінскай выбарчай акругі і падтрымліваюць кандыдатуру тав. Ферэнцовіча ў абласны Совет.

Тав. Ферэнцовіч дзякаваў за вялікае давер'е, аказанае яму, і запэўніў, што апраўдае гэтае давер'е.

Усяго выступіла 9 чалавек. Прадстаўнікі перадвыбарчага сходу прынялі зварот да ўсіх выбаршчыкаў, у якім заклікаюць іх аддаць свае галасы за непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных. Пад доўгія, гучныя апладысменты ўдзельнікі нарады прынялі тэкст прывітальнага пісьма таварышу Сталіну.

Лепшых сыноў і дачок вялікага совецкага народа — у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

Яны апраўдаюць давер'е працоўных

На сходзе рабочых і служачых 18-й беластоцкай тэкстыльнай фабрыкі, прысвечаным вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных, прысутнічае каля 200 чалавек. Сход адкрыў старшыня фабкома тав. Амельчанка. Першым выступае начальнік ткацкага цэха тав. Кананові́ч. Ён прапануе вылучыць кандыдатуру кіраўніка беластоцкага тэкстыльнага трэста Сяргея Міхайлавіча Карташова.

— Тав. Карташоў, — гаворыць Канановіч,—ужо 17 год на кіруючай адказнай рабоце, з якой ён добра спраўляецца. Ён заслугоўвае давер'я народа.

Кандыдатуру аднаго з лепшых людзей прадпрыемства тав. Майсея Гершанавіча Кнышынскага называе ткач тав. Гарыбальдзі. Ткач-стаханавец тав. Кнышынскі мае 28-гадовы вытворчы стаж. Ён адзін з першых перайшоў на абслугоўванне двух станкоў і пастаянна перавыконвае нормы выпрацоўкі.

Кандыдатуру Юзефы Іванаўны Васілеўскай, работніцы-вінтаўшчыцы з 30-гадовым вытворчым стажам вылучае работніца Малышка.

— Я даўно ведаю Васілеўскую,—заяўляе яна.—Я ўпэўнена, што Васілеўская будзе таксама добра працаваць дэпутатам горсовета, як яна працуе ў нас на фабрыцы.

Сход аднагалосна адобрыў вылучаныя кандыдатуры. Затым выбраны тры даверанныя асобы для агітацыі за кандыдатаў і 20 дэлегатаў на перадвыбарчы сход.

Вылучаны партыйныя і непартыйныя большэвікі

Пасля работы рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі першай змены 23-й прадзільна-ткацкай фабрыкі сабраліся на сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

Кандыдатамі ў дэпутаты гарадскога Совета аднадушна вылучаны наступныя таварышы:

Тав. Соцікаў Філіп Андрэевіч, 1906 года нараджэння, начальнік гарадскога аддзела Народнага Камісарыята Унутраных спраў, па паходжанню селянін.

Тав. Мішкоў Владзімір Васільевіч, 1902 года нараджэння. Тав. Мішкоў паходзіць з сям'і рабочага-тэкстыльшчыка. З 12 год працаваў ён на капіталістычных фабрыках у царскай Расіі. 16-гадовым юнаком уступіў добраахвотнікам у Чырвоную Армію і змагаўся ў яе радах па франтах грамадзянскай вайны супроць унутранай і знешняй контррэволюцыі. З 1930 года тав. Мішкоў з'яўляецца членам ВКП(б). Зараз ён працуе галоўным механікам 23 фабрыкі.

Тав. Мазурэк Сігізмунд Пятровіч, 1902 года нараджэння, машыніст, стаханавец вытворчасці.

Тав. Ханін Меер Меерaвіч, 1902 года нараджэння, лепшы стаханавец-чатырохстанэчнік, які выконвае норму на 110 процантаў, актывіст грамадскага жыцця.

Тав. Шыдлоўская Ядвіга Антонаўна, 1912 года нараджэння, прысучальшчыца, актыўная профработніца і грамадчыца.

Д. Розен.

...ЛЕН ПАЎНАМОЦНАЙ КАМІСІІ--КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ

Адбыўся сход рабочых і служачых на Лапскім паравоза-вагонарамонтным заводзе, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў. Сход прайшоў на высокім ідэйна-палітычным узроўні. Рабочыя і служачыя на сходзе аднадушна вылучылі кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета тав. Чэслава Лаўрэнц'евіча Квяткоўскага.

Тав. Квяткоўскі на заводзе працаваў рабочым, цяпер вылучан начальнікам цэха. Ён быў дэпутатам Народнага Сабрання Заходняй Беларусі і членам Паўнамоцнай камісіі Народнага Сабрання на Сесію Вярхоўнага Совета СССР у Маскве.

Кандыдаты 2-га тэкстыльнага камбіната

2 лістапада быў для рабочых 2-га тэкстыльнага камбіната сапраўды знамянальным днём. У гэты дзень камбінат з чэсцю выканаў узятыя соцыялістычныя абавязацельствы, датэрмінова закончыў гадавую вытворчую праграму.

Вось чаму такая выключная радасць ахапіла ўвесь калектыў. У гэты дзень сабраліся рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі камбіната ў клуб на перадвыбарчы сход па вылучэнню кандыдатаў у абласны і гарадскі Советы дэпутатаў працоўных.

Старшыня фабкома тав. Арлоўскі адкрыў перадвыбарчы сход. У прэзідыум выбіраюцца лепшыя людзі камбіната.

Слова бярэ рабочы камбіната тав. Буйло.

— Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных тав. Ражноўскага Івана Вікенц'евіча — старшыню Беластоцкага горвыканкома. Яго кандыдатура аднагалосна падтрымана ўсім калектывам рабочых.

Кандыдатам у дэпутаты горсовета аднагалосна вылучан тав. Кісялёў Нікалай Васільевіч—першы сакратар Беластоцкага абкома партыі, тав. Янчук Георгій Якаўлевіч — дырэктар камбіната, тав. Маславецкі — стаханавец камбіната, тав. Гершковіч—стаханавец камбіната, ініцыятар стаханаўскага руху, стаханаўцы тт. Майсюк, Вайцюхоўская.

Па прапанове тав. Дзянісавай выбраны шэсць даверaных асоб і 40 упаўнаважаных ад выбаршчыкаў камбіната на перадвыбарчую нараду выбаршчыкаў 10 выбарчага ўчастка.

Дастойны кандыдат

Па Гродна пачалося вылучэнне кандыдатаў у абласны Совет дэпутатаў працоўных. На веласіпедным заводзе, табачнай фабрыцы, скурзаводзе № 7, педвучылішчы і настаўніцкім інстытуце адбыліся агульныя сходы. Яны праходзілі з выключным ажыўленнем і актыўнасцю.

Пасля заняткаў у прасторны, светлы зал сабраліся студэнты і выкладчыкі педвучылішча. Слова прадастаўляецца настаўніку тав. Фурык.

— Ад імені нашага калектыва,—гаворыць ён,—я прапаную вылучыць у абласны Совет вернага сына народа, дэпутата Вярхоўнага Совета СССР, беларускага паэта Філіпа Сямёнавіча Пестрака.

Філіп Сямёнавіч Пестрак прайшоў цяжкі шлях жыцця. Ён доўгія годы прасядзеў у польскіх турмах за справу працоўных.

На ўсіх сходах вылучаны таварышы на нарады ўпаўнаважаных, якія адбудуцца па акругах.

С. Партной.

Вылучылі лепшую трактарыстку

АЎГУСТОЎ. (**По тэлефону ад нашага карэспандэнта**). На лесапільным заводзе «Неса» адбыўся многалюдны сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў. Аднагалосна вылучана кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета трактарыстка Аўгустоўскай МТС тав. Елена Юзефаўна Пілецкая. Працуючы трактарысткай, яна паказвае ўзоры высокай прадукцыйнасці працы. Нядаўна яна скончыла курсы трактарыстаў і добра асвоіла спецыяльнасць трактарысткі, сістэматычна перавыконваючы норму выпрацоўкі. Рашэнне рабочых лесапільнага завода падтрымліваюць рабочыя іншых прадпрыемстваў і служачыя ўстаноў горада Аўгустова.

Верны сын народа

СУХАВОЛЛЕ. (**Ад нашага карэспандэнта**). 3-га лістапада ў мястэчку Сухаволлі, Дамбраўскага раёна, адбыўся перадвыбарчы сход членаў кааператыўных арцелей: шаўцоў і краўцоў. На сходзе было абмеркавана пытанне аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета.

Першае слова ўзяў член арцелі тав. Фур'е. Ён сказаў:

— Настаў самы адказны перыяд выбарчай кампаніі. Нам трэба вылучыць у мясцовыя Советы лепшых людзей народа, якія даказалі сваю адданасць справе комунізма. Я думаю, што такім чалавекам з'яўляецца Сяргей Осіпавіч Прытыцкі. Хто не ведае гэтага бясстрашнага, няўтомнага змагара з польскім фашызмам!

Выступіўшы затым тав. Бераэн горача падтрымаў прапанову тав. Фур'е.

Аднагалосна прынята рашэнне — вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па Сухавольскай выбарчай акрузе тав. Прытыцкага Сяргея Осіпавіча — намесніка старшыні Беластоцкага аблвыканкома.

* * *

Сяляне мястэчка Сухаволле на сваім сходзе вылучылі кандыдатам у раённы Совет начальніка раённага аддзялення народнага Камісарыята ўнутраных спраў тав. Аляксея Іванавіча Елкіна.

Інтэлігенцыя мястэчка Новы Двор вылучыла кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па Новадворскай выбарчай акрузе ўрача, актыўнага грамадскага працаўніка т. Рэгіну Іосіфаўну Вітукевіч. Тав. Вітукевіч актыўна ўдзельнічае ў жыцці свайго раёна.

В. Гарбанёў

Радыёпераклічка Масква—Беласток

1-ы і 2-і беластоцкія тэкстыльныя камбінаты год таму назад заключылі соцыялістычны дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва з «Трохгорнай мануфактурай» імені Дзержынскага.

3-га лістапада ў 7 гадзін вечара адбылася радыёпераклічка, арганізаваная рэдакцыямі газет «Московский большевик» і «Вольная праца». Прадстаўнікі спаборнічаючых прадпрыемстваў расказалі, з чым яны сустракаюць усенароднае свята—XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. СКЛЯРЭНКА
(Дырэктар «Трохгорнай мануфактуры» імені Дзержынскага).

У соцыялістычным дагаворы з 1-м і 2-м беластоцкімі камбінатамі мы абавязаліся выканаць вытворчую праграму да 12 снежня, але мы спадзяемся выканаць да 1 снежня. II-месячная праграма будзе выканана: па прадзенню—10 лістапада, па ткацтву—11 лістапада і па аддзелцы—таксама 11 лістапада. Па якасных паказчыках нашы ткачы асабліва прарабілі вялікую работу. Ткацкая фабрыка знізіла другі сорт да мінімальных размераў. Лепшыя людзі, якія працуюць на камбінаце і прысутнічаюць зараз тут, у студыі, тт. Серэнікова, Руміна, Розенкава, Міхайлаў і іншыя, паказваюць выдатныя ўзоры працы.

Я думаю, што рабочыя 1-га і 2-га камбінатаў за гэты перыяд дабіліся таксама нямалых поспехаў у сваёй рабоце. Нам хацелася-б, каб вы расказалі, як вы арганізавалі перадкастрычніцкае спаборніцтва, якіх поспехаў дасягнулі ў рэзультаце гэтага спаборніцтва, з якімі паказчыкамі вы прыходзіце да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ІВАНОВАЙ
(Зменны майстар «Трохгорнай мануфактуры»).

Добры дзень, дарагія таварышы! Прайшоў амаль год, як мы да вас прыязджалі, каб перадаць свой вопыт работы. Я прыязджала да вас у той час, калі працавала ткачыхай на 16 станках, і вы здзіўляліся, як гэта жанчына можа працаваць на ткацкіх станках, ды яшчэ на 16! А пасля гэтага мяне вылучылі на работу зменным майстрам ткацкай фабрыкі. І вось ужо 11 месяцаў, як я паспяхова кірую другой зменай.

У маім веданні 440 станкоў. Я кірую 60 ткачамі. Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, нашы ткачы ўзялі на сябе канкрэтныя соцыялістычныя абавязацельствы. Свае абавязацельствы мы паспяхова выконваем. Даем прадукцыю добрай якасці.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ЛАПЕНКОВАЙ
(Ткачыха «Трохгорнай мануфактуры»).

Паўтара месяцы таму назад я была ў вас. Звярнуўшыся ў Маскву, я ўключылася ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва і працую зараз на 18 станках. Нормы выпрацоўкі выконваю на 115 процантаў і даю прадукцыю высокай якасці. Я расказала сваім таварышам, чаго вы дабіліся за перыяд савецкай улады. Яны прасілі мяне перадаць вам гарачае прывітанне.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. МІХАЙЛАВА
(Стаханавец «Трохгорнай мануфактуры»).

Вярнуўшыся ад вас, я быў выбран дэпутатам Маскоўскага Совета. Працоўныя аказалі мне вялікае давер'е, выбраўшы мяне сваім дэпутатам. Я працую на «Трохгорцы» 40 год. З'яўляюся стаханаўцам, адначасова выконваю дэпутацкія абавязкі.

Зараз у вас праходзіць выбарчая кампанія па выбарах у мясцовыя Советы. Несумненна, вы выбераце ў дэпутаты лепшых, адданых людзей.

Я сустракаю XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі вялікімі вытворчымі поспехамі. Норму выпрацоўкі выконваю на 120 процантаў, даю прадукцыю добрай якасці. Наш цэх датэрмінова выканаў дзесяцімесячную праграму.

У мікрафона прадстаўнікі тэкстыльшчыкаў Беластока

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. КАРТАШОВА
(Кіраўнік тэкстыльнага трэста).

Год таму назад вы былі ў нас, у Беластоку, і заключылі дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва з 1-м і 2-м камбінатамі. За гэты перыяд камбінаты як 1-ы, так і 2-гі і рад іншых прадпрыемстваў па трэсту значна змяніліся. Дзевяцімесячная праграма выканана на 103 проц. Праграму за кастрычнік выканалі на 102 проц. У перадкастрычніцкім спаборніцтве з лепшымі паказчыкамі па трэсту вышлі 2-і, 6-ы, 13-ы, 8-ы камбінаты і плюшавая фабрыка. У нас значна вырас лік стаханаўцаў-многастаночнікаў. На 1 студзеня 1940 года іх налічвалася 110. Зараз мы маем 1.556 многастаночнікаў.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ЯНЧУКА
(Дырэктар 2-га беластоцкага камбіната).

Я рад вам паведаміць, што гадавы план выканан учора, 2 лістапада. Калектыў даў краіне 1.341 тысячу метраў гатовага тавару пры плане ў 1.340 тысяч метраў. Калектыў камбіната дабіўся значнага паляпшэння якасці прадукцыі. За кастрычнік месяц мы далі 90,9 процанта першага сорту замест прадугледжаных па плану 87 процантаў. Перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва ў нас азнаменавалася правядзеннем стаханаўскіх вахт. Гэтыя вахты дазволілі нам ускрыць вялікія рэзервы, якія мае ў сваім распараджэнні наш камбінат. У дні стаханаўскіх вахт усе рабочыя перавыконвалі нормы выпрацоўкі. Так, ткач Нетушскі выканаў норму на 139 процантаў, Вільчэўскі—на 138 і Берыла—на 129 процантаў.

За лепшыя паказчыкі работы ў першым і другім квартале ў соцыялістычным спаборніцтве з 1-ым камбінатам наш калектыў атрымаў пераходны чырвоны сцяг, устаноўлены вашым перадавым прадпрыемствам.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ЯГОРАВА
(Дырэктар 1-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната).

Наш камбінат перавыканаў 10-месячную вытворчую праграму: па прадзенню—на 111 процантаў, па ткацтву—на 104,1 проц. і па гатоваму тавару—на 102,6 процанта, даўшы звыш плана 1.080 тысяч метраў тонкасуконных тканін. З 165 ткачоў 86 з'яўляюцца двухстаночнікамі, з якіх 72 выконваюць нормы ад 100 да 120 проц.

Рашэннем журы пераходны чырвоны сцяг «Трохгорнай мануфактуры» за рэзультаты работы першага паўгоддзя перадан калектыву 2-га камбіната. Але мы заяўляем, што далейшым разгортваннем соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху даб'емся лепшых паказчыкаў у сваёй рабоце і заваюем пераходны чырвоны сцяг.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ЖЫЎЛЮК
(Стаханаўка 1-га камбіната).

Таварышы трохгорцы! Я працую на двух сельфактарах вінтаўшчыцай. Разам са мной працуюць тт. Луцкевіч, Вішнеўская, Духнэўская і Врубель. Мы, рыхтуючыся да вялікага свята, выканалі план на 118 процантаў. Калектыў нашага цэха ўзяў на сябе абавязацельства да дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных—15 снежня—выканаць гадавы план.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ВІЛЬЧЭЎСКАГА
(Ткач-двухстаночнік 2-га камбіната)

Я хачу падзяліцца з вамі, як працуе наш ткацкі цэх. 3 месяца ў месяц мы перавыконваем план. Многастаночнікі ўжо абслугоўваюць палавіну ткацкіх станкоў. За кастрычнік далі 91 процант першага сорту.

Я працую на двух станках і выконваю нормы на 115—120 процантаў. У дзень стаханаўскай вахты я выканаў норму на 138,7 процанта. Жыву вясёлым і радасным жыццём пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. СТОЦКАЙ.
(Стаханаўка 1-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната)

Апаратна-прадзільны цэх, у якім я працую на складаным суконным кардачэсальным апараце, перавыканаў дзевяцімесячную вытворчую праграму і план за кастрычнік месяц.

Я 14 год працавала на фабрыцы пры капіталістах і толькі 15-ы год маёй працы на савецкім прадпрыемстве быў напоўнен радасцю і шчасцем.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

Мужны сын радзімы

ВАЎКАВЫСК **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).**

2 лістапада адбыўся сход калгаса імені Сталіна, Ізабелінскага сельсовета. На сходзе з кароткай прамовай выступіў прадстаўнік райкома партыі тав. Акуліч.

Слова прадастаўляецца лепшаму калгасніку Самуілу Осіпавічу Казёл.

— Сёння ў нас радасная ўрачыстасць,—заяўляе тав. Казёл.— Мы, свабодныя грамадзяне краіны соцыялізма, вызваленыя назаўсёды з пад іга памешчыкаў і капіталістаў сабраліся вылучыць у мясцовыя органы сваёй улады кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Я прапаную вылучыць нашым кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета Героя Совецкага Саюза Сяргея Аляксандравіча Чэрных. Сяргей Аляксандравіч лепшы сын народа, ён з чэсцю апраўдае наша давер'е.

Прапанову тав. Казёл прысутныя сустрэлі бурнымі апладысментамі і воклічамі «ура» у чэсць вялікага Сталіна.

Сход аднадушна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета Героя Совецкага Саюза Сяргея Аляксандравіча Чэрных, члена большэвіцкай партыі. Калгаснікі просяць тав. Чэрных даць сваю згоду балатыравацца кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па 32 выбарчай акрузе і заклікаюць выбаршчыкаў галасаваць за тав. Чэрных.

* * *

На сходзе калгаса імені Варашылава, Дзевяткаўскага сельсовета, кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета аднагалосна вылучан старшыня Ваўкавыскага райвыканкома Іван Сцяпанавіч Дашук.

У прынятай рэзалюцыі калгаснікі аднагалосна пастанавілі вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета старшыню Ваўкавыскага райвыканкома Івана Сцяпанавіча Дашука, 1898 года нараджэння, беларуса, члена ВКП(б) з 1919 года, узнагароджанага ўрадам Совецкага Саюза ордэнам «Знак почета».

Д. Казлоў.

Вылучаны лепшыя людзі

ЗАМБРАВА. У раёне пачалося вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты абласнога і раённага Советаў. Кандыдатамі вылучаюцца лепшыя прадстаўнікі рабочых, сялян, інтэлігенцыі. Сяляне Калакскага сельсовета сваім кандыдатам у дэпутаты ў абласны Совет вылучылі сакратара Беластоцкага абкома комсамола тав. Стрыжака.

У раённы Совет сяляне вёскі Завады сваім кандыдатам вылучылі ўдзельніка Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, дырэктара няпоўнай сярэдняй школы Аляксандра Баневінтавіча Дзвілінскага. Сяляне Руткоўскага сельсовета кандыдатам у дэпутаты райсовета на сваіх сходах аднагалосна вылучылі старшыню сельсовета, у мінулым селяніна вёскі Руткі, тав. Вацлава Іосіфавіча Вайцэховіча. У гэтым-жа сельсовеце кандыдатам у дэпутаты раённага совета вылучана маладая сялянка актывістка Рамуальда Канстанцінаўна Данішэўская.

На сходзе сялян вёскі Родніца

ПАРЭЧЧА. **(Па тэлефону).** 3-га лістапада адбыўся сход сялян вёскі Родніца, Родніцкага сельсовета. Прысутнічала 60 чалавек. З інфармацыяй аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў выступіў прадстаўнік райкома партыі тав. Часнакоў. Пасля яго слова ўзяў тав. Аксцін. Ён прапанаваў вылучыць кандыдатам у дэпутаты раённага Совета дэпутатаў працоўных тав. Браніслава Казіміравіча Сураўца. Сяляне аднадушна падтрымалі гэтую прапанову. Тав. Суравец — дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, працуе старшынёй Роднецкага сельсовета.

Сход сялян вёскі Дзерыжэлі вылучыў кандыдатам у дэпутаты раённага Совета сакратара райкома партыі тав. Фёдара Трафімавіча Анапіча.

Кандыдаты блока комуністаў і беспартыйных

БЕЛЬСК. **(Па тэлефону).** На прадпрыемствах, у калгасах і вёсках праходзяць сходы рабочых, служачых і сялян, прысвечаныя вылучэнню кандыдатаў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Рабочыя і служачыя кафельнага завода, чыгуначнай станцыі Бельск і сяляне вёскі Калады сваім кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета вылучылі дэпутата Вярхоўнага Совета СССР Марыю Іванаўну Дз'ячук. Яны аднадушна просяць тав. Дз'ячук даць сваю згоду балатыравацца па Бельскай выбарчай акрузе па выбарах у абласны Совет.

Па Гацькаўскай выбарчай акрузе па выбарах у абласны Совет сяляне вёскі Аўгустова і калгаснікі сельгасарцелі імені Варашылава вылучылі кандыдатам у дэпутаты старшыню Бельскага райвыканкома Герасіма Іванавіча Русака.

Калгаснікі сельгасарцелі імені Сталіна і сяляне вёскі Грабавец кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета вылучылі маладую калгасніцу сельгасарцелі імені Сталіна стаханаўку Антаніну Іванаўну Федарчук.

У раённы Совет дэпутатаў працоўных вылучана настаўніца Соф'я Іосіфаўна Панасюк, селянін-бядняк Ефім Філіпавіч Асінюк, старшыня Філікоўскага сельсовета Грыгорый Іванавіч Сіманенка.

Кандыдаты Гродна

ГРОДНА. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** У 5 гадзін вечара памяшканне клуба веласіпеднага завода запоўнілі рабочыя і служачыя. Яны сабраліся сюды на мітынг, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у абласны Совет дэпутатаў працоўных. Аб палітычным значэнні прадстаячых выбараў гаварыў намеснік старшыні горвыканкома тав. Штэйнбах.

Тав. Штэйнбах прапанаваў вылучыць у абласны Совет кандыдатуру старшыні Беластоцкага аблвыканкома тав. Мальцава Сяргея Іванавіча, 1895 года нараджэння, члена партыі з 1918 года, дэпутата Вярхоўнага Совета БССР

Слова атрымаў лепшы стаханавец завода тав Александровіч.

— Выбарчая кампанія,—гаворыць ён,—праходзіць у складанай міжнароднай абстаноўцы. Амаль увесь капіталістычны свет уцягнут у другую імперыялістычную вайну. Толькі адна краіна Советаў, дзякуючы мудрай сталінскай палітыцы міру, спакойна будуе сваё новае жыццё. Каб і ў далейшым мы маглі адстайваць справу міру, трэба мацаваць абараназдольнасць нашай радзімы. У Советы мы павінны паслаць такіх людзей, якія змаглі-б яшчэ лепш паставіць справу абароннай магутнасці краіны. Мы павінны паслаць людзей, якія чула адносяцца да запатрабаванняў працоўных. Кандыдатура тав. Мальцава поўнасцю адпавядае гэтым якасцям. Я ўпэўнен, што ён апраўдае наша давер'е.

Калектыў рабочых табачнай фабрыкі вылучыў кандыдатам у абласны Совет тав. Осіпаву, загадчыка сталовай. У нядаўнім мінулым тав. Осіпава—работніца фабрыкі, стаханаўка.

Студэнты і выкладчыцкі персанал настаўніцкага інстытута кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета вылучылі лепшую настаўніцу тав. Гаўрылюк.

Г. Лупсякоў.

Перадавых, актыўных жанчын—у Советы

Пры вялікай актыўнасці прайшоў сход калгаснікаў сельгасарцелі «Новае жыццё», Галынкаўскага сельсовета, Сапоцкінскага раёна. Калгаснікі на сходзе аднадушна вылучылі кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета брыгадзіра свайго калгаса Юзефу Іванаўну Екімовіч. Юзефа Іванаўна па нацыянальнасці палячка, беспартыйная, нараджэння 1915 года. У калгасе яна карыстаецца вялікім аўтарытэтам. Яе брыгада з'яўляецца перадавой брыгадай калгаса. Калгаснікі сельгасарцелі «Новае жыццё» заклікаюць выбаршчыкаў Рыгалаўскай выбарчай акругі № 81 па выбарах у абласны Совет падтрымаць іх кандыдатуру і ў дзень выбараў аддаць свае галасы за тав. Екімовіч.

На сходзе працоўных м. Сапоцкіна прысутнічала 230 чалавек. Член шавецкай арцелі тав. Каспельянц прапанаваў ад імя схода вылучыць кандыдатам у дэпутаты Сапоцкінскага раённага Совета тав. Тоафілю Осіпаўну Кульвінскую, былую батрачку, актывістку грамадскай работы. Яго прапанову сход падтрымаў аднадушна і вынес рашэнне прасіць т. Кульвінскую даць сваю згоду балатыравацца іх кандыдатам у раённы Совет.

* * *

На сходзе калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі імені 1-га Мая, Монькаўскага раёна, кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета аднагалосна вылучана калгасніца-стаханаўка Хелена Адамаўна Літман. Тав. Літман—адна з першых у сакавіку ўступіла ў новаарганізаваны калгас. Старшыня калгаса тав. Браткоўскі ў сваёй прамове на сходзе характарызаваў тав. Літман як чэсную і адданую радзіме грамадзянку. Калгаснікі просяць тав. Літман даць сваю згоду балатыравацца па Кнышынскай выбарчай акрузе па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных.

* * *

ЕДВАБНА. На сходзе сялян вёскі Янчэва, Бажэўскага сельсовета, прысутнічала 120 чалавек. Аднагалосна вылучана кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па Едвабнаўскай выбарчай акрузе тав. Ірына Воўжэўна Вішнеўская — старшыня гарадскога пасялковага Совета Едвабна.

КАНДЫДАТЫ СКІДЭЛЬСКАГА РАЁНА

СКІДЭЛЬ. Калгаснікі сельгасарцелі імені Калініна і сход настаўнікаў мястэчка Вяліка-Дамбрава вылучылі кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па Веліка-Дамбраўскай выбарчай акрузе па выбарах у абласны Совет тав. Яніну Іванаўну Садоўскую. Тав. Садоўская ў мінулым батрачка, актыўны ўдзельнік грамадскай работы.

Працоўная інтэлігенцыя горада Скідэль і калгаснікі сельгасарцелі імені Сталіна па Чыжаўскай выбарчай акрузе кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета вылучылі сакратара райком партыі тав. Сямёна Кандрац'евіча Талкачэва.

Па Зарэмбаўскай выбарчай акрузе кандыдатам вылучан Павел Ягоравіч Канавалаў.

У раённы Совет дэпутатаў працоўных на сходах рабочых, сялян і інтэлігенцыі вылучана 12 кандыдатаў. Вылучэнне працягваецца.

ПАЎСЯДЗЁННА ВУЧЫЦЬ І ВЫХОЎВАЦЬ КОМСАМОЛЬСКІЯ КАДРЫ

У Беластоцкай абласной арганізацыі ЛКСМБ праводзіцца вялікая работа па вылучэнню комсамольцаў на кіруючую работу. Толькі на кіруючую комсамольскую работу вылучана 82 чалавекі.

Справаздачна-выбарчыя сходы пярвічных комсамольскіх арганізацый, раённыя, гарадскія сходы і канферэнцыі ЛКСМБ ярка паказалі, наколькі палітычна выраслі нашы кадры.

Падводзячы вынікі работы за справаздачны перыяд, крытыкуючы недахопы ў рабоце, комсамольцы з усёй сур'ёзнасцю падышлі да вылучэння кандыдатаў у новы састаў кіруючых комсамольскіх органаў. Аб гэтым гаворыць той факт, што з 1.918 вылучаных кандыдатур для тайнага галасавання было адведзена са спіскаў 174 чалавекі.

У выніку ўмелага адбору і смелага вылучэння да кіраўніцтва пярвічнымі комсамольскімі арганізацыямі прышоў малады комсамольскі актыў. З 541 сакратара пярвічных комсамольскіх арганізацый 226 выбраны ўпершыню.

Да кіраўніцтва комсамольскімі арганізацыямі прышлі маладыя, энергічныя актывісты, здольныя тварыць вялікія справы, быць сапраўднымі важакамі моладзі. Але гэтыя маладыя кадры маюць патрэбу ў паўсядзённай канкрэтнай дапамозе.

Адной з першачарговых задач работы з кадрамі комсамольскіх арганізацый з'яўляецца работа з сакратарамі і намеснікамі сакратароў пярвічных арганізацый і камітэтаў.

Але было-б няправільна думаць, што работа з кадрамі абмяжоўваецца толькі зацвярджэннем сакратароў на бюро.

Сакратароў пярвічных комсамольскіх арганізацый трэба вучыць на практычнай рабоце, сістэматычна паказваць ім, як трэба падрыхтоўваць і праводзіць комсамольскія сходы. Мы павінны навучыць сакратароў правільна разумець і праводзіць у жыццё рашэнні XVIII з'езда ВКП(б), Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года аб працоўнай дысцыпліне, ад 2 кастрычніка аб дзяржаўных працоўных рэзервах і т. д. Мы павінны папрацаваць над тым, каб рашуча палепшыць работу па ўзняццю ідэйна-палітычнага ўзроўню комсамольцаў, і ў першую чаргу, сакратароў, намеснікаў сакратароў пярвічных комсамольскіх арганізацый і членаў камітэтаў. Неабходна давесці да глыбокага разумення кожнага сакратара палітычнае значэнне рашэнняў XI Пленума ЦК ВЛКСМ, навучыць комсамольскія кадры ператвараць гэтыя рашэнні ў жыццё.

Пасля XI пленума ЦК ВЛКСМ платны апарат райкомаў і гаркомаў вобласці скарочан напалавіну. Створаны сталыя камісіі, у якіх занята каля тысячы чалавек лепшага комсамольскага актыва.

Ва многіх раёнах гэтыя камісіі праводзяць вялікую работу.

Добра, напрыклад, працуе камісія прапаганды і агітацыі Аўгустоўскага райкома ЛКСМБ, якой кіруе тав. Кельс. Камісія намеціла і праводзіць у жыццё мерапрыемствы па падняццю ідэйна-палітычнага ўзроўню комсамольцаў. Тав. Кельс сама часта гутарыць з комсамольцамі, высвятляе, як яны вывучаюць асновы марксізма-ленінізма, дапамагае разбірацца ў незразумелых пытаннях. Камісія па культурна-масавай рабоце Гродненскага райкома комсамола, якой кіруе тав. Лешчэнка, дабіваецца паляпшэння работы палітасветных устаноў.

Але так абстаяць справы не ўсюды. Некаторыя райкомы і гаркомы абмежавалі перабудову работы толькі тым, што скарацілі платны апарат і фармальна стварылі камісіі. Такое становішча мае месца ў Кольнаўскім, Сапоцкінскім і Бранскім райкомах комсамола.

Па прапанове Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ у райкомах і гаркомах комсамола, на тэрыторыі якіх адкрываюцца рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння, ствараюцца сталыя камісіі па рабоце сярод навучаючайся моладзі. Пры дапамозе гэтых камісій райкомы і гаркомы комсамола павінны актыўна ўдзельнічаць у правядзенні прызыву (мабілізацыі) гарадской і калгаснай моладзі ў школы і вучылішчы, усё падрыхтаваць да сустрэчы новага папаўнення, а калі пачнецца вучоба — нястомна працаваць з маладымі людзьмі, расціць і выхоўваць іх, рыхтаваць дысцыплінаваныя, адданыя справе комунізма кваліфікаваныя працоўныя рэзервы СССР.

У гэтыя камісіі павінны ўвайсці лепшыя комсамольцы — стаханаўцы, майстры, тэхнікі, кіраўнікі пярвічных комсамольскіх арганізацый. Узначальваць камісіі павінны сакратары райкомаў і гаркомаў комсамола.

Многа прадстаіць папрацаваць сталым камісіям па падрыхтоўцы да заняткаў у рамесленых, чыгуначных вучылішчах і школах фабрычна-заводскага абучэння.

У перыяд з 10 па 25 лістапада 1940 года як шляхам прызыву, так і шляхам адкрытага (добраахвотнага) набору ў новыя кузні кадраў будзе прынята ў нашай вобласці 1.160 чалавек. З 1 снежня гэтая моладзь прыступіць да вучобы. Таму за ўсіх школах і вучылішчах да паказанага тэрміну павінны быць поўнасцю падрыхтаваны штаты выкладчыкаў як па агульнаадукацыйных прадметах, так і па спецыяльных дысцыплінах.

Работа вялікая і адказная! Справа чэсці сталых камісій гаркомаў і райкомаў ЛКСМБ — прыняць у гэтай рабоце самы блізкі, самы жывы і дзейны ўдзел.

Кадры, людзі рашаюць поспех кожнай справы. Гэта павінен памятаць комсамольскі кіраўнік. Важнейшая задача райкомаў і гаркомаў ЛКСМБ — паўсядзённа вучыць і выхоўваць комсамольскія кадры.

П. МАЎРЫН,
сакратар Беластоцкага абкома ЛКСМБ.

КАСТРЫЧНІЦКАЕ ЎЗБРОЕНАЕ ПАЎСТАННЕ

(Гутарка трэцяя)*

I

Пабеданоснае кастрычніцкае ўзброенае паўстанне ў Расіі ў 1917 годзе было праведзена рабочымі і салдацкімі масамі пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, якая к гэтаму часу заваявала бязмежнае давер'е мас сваёй рашучай абаронай інтарэсаў працоўных, барацьбой супроць грабежніцкай вайны і буржуазнага ўрада.

Заклікаючы партыю к паўстанню, Ленін у сваім пісьме ў Цэнтральны Камітэт пісаў:

«Перад намі ў наяўнасці ўсе аб'ектыўныя прадпасылкі паспяховага паўстання. Перад намі — выгады становішча, калі толькі наша перамога ў паўстанні пакладзе канец змучыўшым народ хістанням, гэтай самай мучыцельнай рэчы на свеце; калі толькі наша перамога ў паўстанні сарве гульню з сепаратным мірам супроць рэволюцыі, сарве яе тым, што прапануе адкрыты мір больш поўны, больш справядлівы, больш блізкі, мір у карысць рэволюцыі». (Ленін, том 21, стар. 197).

У парадак дня ўсёй работы партыі стала падрыхтоўка ўзброенага паўстання. Ленін указваў, што, рашыўшыся на паўстанне, трэба ісці да канца, што неабходна сабраць рашаючыя сілы ў рашаючым пункце і ў ходзе паўстання захваць маральную перавагу над ворагам, замацоўваць для гэтага штодзённа, штогадзінна поспех за поспехам, бо абарона—смерць узброенага паўстання.

Пісьмы Леніна абмяркоўваліся ў Цэнтральным Камітэце большэвікоў і былі разасланы буйнейшым арганізацыям большэвіцкай партыі.

З канца верасня партыя большэвікоў рашае мабілізаваць усе свае сілы для арганізацыі паспяховага паўстання.

Цэнтральны Камітэт большэвікоў 24 верасня заклікаў партыю патрабаваць неадкладнага склікання з'езда Советаў, а на месцах прыступіць да склікання явачным парадкам абласных і акруговых з'ездаў.

Меншавікі і эсэры, якія знаходзіліся ў Цэнтральным выканаўчым камітэце пад націскам мас, пастанавілі склікаць II з'езд Советаў 20 кастрычніка.

II

29 верасня Цэнтральны Камітэт пастанавіў склікаць на 5 кастрычніка з'езд Советаў Паўночнай вобласці. Рашэнні гэтага з'езда павінны былі паслужыць прыкладам для правядзення абласных з'ездаў па ўсёй краіне.

Падрыхтоўка да ўзброенага паўстання ў другой палове верасня прыняла шырокі размах і ў правінцыі. ЦК даручыў працуючым у Беларусі тт. Фрунзе, Мяснікову і іншым большэвікам на ўсіх вузлавых станцыях Беларусі выставіць свае большэвіцкія кардоны з той мэтай, каб не пусціць эшалоны, ідучыя з заходняга фронта на дапамогу Керэнскаму. ЦК даў таксама даручэнне Палескай арганізацыі, якая знаходзілася ў Гомелі, на чале якой стаяў Л. М. Кагановіч. Праз Гомель праходзілі воінскія часці ў Петраград і Маскву. Уральскім большэвікам было дадзена ўказанне, што ў выпадку затрымкі з паўстаннем у Петраградзе і Маскве, працягваць пачатае ўзброенае паўстанне на Урале. Былі пастаўлены поўныя задачы і перад іншымі мясцовымі партыйнымі арганізацыямі.

З асаблівым размахам вялася работа па падрыхтоўцы паўстання ў Петраградзе. У Петраградзе ў кастрычніку быў распрацаван план выступлення. 7 кастрычніка увечары у Петраград прыбыў Ленін. На другі дзень пасля свайго прыезду ў Петраград Ленін сустрэўся з таварышам Сталіным.

10 кастрычніка адбылося пасяджэнне ЦК.

На пасяджэнні ЦК тав. Свярдлоў паведаміў аб становішчы на паўночным і заходнім франтах. Ленін выступіў з дакладам па бягучаму моманту. У сваім дакладзе Ленін указваў, што «...палітычная справа зусім паспела для пераходу ўлады... Трэба гаварыць аб тэхнічным баку. У гэтым уся справа». (Ленін, том 21, стар. 326).

У прапанаванай Леніным і прынятай Цэнтральным Камітэтам рэзалюцыі гаворыцца:

«Прызнаючы такім чынам, што ўзброенае паўстанне непазбежна і зусім паспела, ЦК прапануе ўсім арганізацыям партыі кіравацца гэтым і з гэтага пункту гледжання абмяркоўваць і вырашаць усе практычныя пытанні...» (Ленін, том 21, стар. 330).

Толькі здраднікі Каменеў і Зіноўеў выступілі на пасяджэнні ЦК супроць Леніна. Капітулянтам быў дадзены рашучы адпор.

16 кастрычніка ўвечары адбылося пашыранае пасяджэнне ЦК. На гэтым пасяджэнні прысутнічалі прадстаўнікі месц, прафсаюзаў, ваенных арганізацый. Дакладчыкі паведамілі аб гатоўнасці мас выступіць па закліку большэвікоў. На закрытым пасяджэнні было пастаноўлена: для кіраўніцтва паўстаннем стварыць партыйны цэнтр на чале з таварышам Сталіным.

III

Партыя большэвікоў усю сваю дзейнасць накіравала на падрыхтоўку і правядзенне паўстання. Паўстанне падрыхтоўвалася ўтайне. Але здраднікі Зіноўеў і Каменеў 18 кастрычніка надрукавалі ў меншавіцкай газеце пісьмо аб сваіх рознагалоссях з Леніным. Яны выдалі ворагу рашэнне ЦК большэвікоў аб паўстанні. У сваю чаргу Троцкі выбалбатаў тэрмін паўстання.

Контррэволюцыя хоча апярэдзіць большэвікоў з паўстаннем і назначае сваё выступленне на 24 кастрычніка. Але Цэнтральны Камітэт большэвікоў вырашае пачаць выступленне за дзень да II з'езда Советаў.

24 кастрычніка, гадзін каля 6 раніцы, юнкеры сталі грамць большэвіцкую газету «Рабочий путь». Шум прыцягнуў увагу рабочых. Сярод сабраўшыхся былі чырвонагвардзейцы. Аб дзеяннях юнкераў паведамілі Сталіну. Па ўказанню Сталіна былі высланы браневікі. Юнкеры захапілі 8 тысяч экземпляраў газеты і ўцяклі.

Нападзенне юнкераў гаварыла аб многім: трэба было дзейнічаць. На пасяджэнні ЦК было вынесена рашэнне аб неадкладным паўстанні супроць буржуазнага ўрада. Рэволюцыйныя палкі падрыхтаваліся да выступлення. У Кранштадтскі Совет перадалі распараджэнне выслаць атрад рэволюцыйных маракоў.

Ад Керэнскага контррэволюцыя патрабавала неадкладна падавіць паўстанне. У 2 гадзіны 05 мінут Керэнскі паспешыў у Зімні палац прыняць меры супроць паўстання. У Смольным-жа на пасяджэнні ЦК было вырашана: Дзяржынскаму заняць пошту і тэлеграф, у Кранштадт паслаць двух прадстаўнікоў, папярэдзіць Маскву аб пачаўшымся ўзброеным паўстанні, выклікаць з штаба 2 тысячы чырвонагвардзейцаў. Свярдлаву было даручана арганізаваць нагляд за дзеяннямі Часовага ўрада.

Па распараджэнню Керэнскага юнкеры каля 3 гадзін з'явіліся ля мастоў з мэтай развесці іх і адрэзаць рабочыя раёны ад цэнтра. Але там ужо знаходзіліся чырвонагвардзейцы, маракі і салдаты гарнізона. Юнкеры змаглі захапіць толькі Нікалаеўскі мост.

Ваенна-рэволюцыйны камітэт загадаў камісару крэйсера «Аўрора» адбіць мост у юнкераў. У гэты час на бок рэволюцыі пераходзіць Петрапаўлаўская крэпасць.

Атрады Чырвонай гвардыі і рэволюцыйных салдат к 5 гадзінам займаюць тэлеграф. Ва ўсе абласці было перадана паведамленне аб тым, што паўстанне пачалося.

IV

Як толькі Ленін даведаўся, што Нікалаеўскі мост аказаўся ў руках юнкераў, зараз-жа ім была напісана запіска і адпраўлена ў Смольны. Пасля адказу Ленін напісаў другую запіску, у якой указваў:

«Таварышы!

Я пішу гэтыя радкі ўвечары 24-га, становішча данельга крытычнае. Ясней яснага, што цяпер, ужо паісціне, прамаруджанне ў паўстанні смерці падобна...

...ні ў якім выпадку не астаўляць улады ў руках Керэнскага і К° да 25-га. Ніякім чынам; рашаць справу сёння абавязкова ўвечары ці ўночы». (Ленін, творы, том XXI, стар. 362).

Позна ўвечары з сувязістам Цэнтральнага Камітэта Ленін адпраўляецца ў Смольны. Да Смольнага Уладзімір Ільіч дабраўся к поўначы. Ленін падняўся на другі паверх. Убачыў Сталін. Смольны быў ярка асветлен. Па калідорах з грукатам пацягнулі кулямёты. Прахадзілі чырвонагвардзейцы, маракі. Таварыш Сталін паведаміў Леніну аб прынятых мерах. Ленін адобрыў усе распараджэнні Сталіна.

У 1 гадзіну 25 мінут быў заняты паштамт. У 2 гадзіны ночы былі захоплены вакзалы, электрастанцыя. У 6 гадзін раніцы быў заняты Дзяржаўны банк. У 7 гадзін раніцы быў заняты Дварцовы мост пад вокнамі Керэнскага. Керэнскі кінуўся ў штаб акругі. Там заявілі, што ні адзін полк не вышаў, што нават казакі адмовіліся выступіць. Раённыя штабы Чырвонай гвардыі ноччу акружылі казачыя палкі ўзброенымі атрадамі. Таксама былі акружаны некаторыя юнкерскія вучылішчы.

Керэнскі выратоўваецца ўцёкамі. Ён выехаў на Неўскі ў машыне пад амерыканскім флагам. Чырвонагвардзейцы прапусцілі машыну нейтральнай дзяржавы. Керэнскі адправіўся ў Царскае сяло, а адтуль на фронт, у Пскоў.

V

У руках у Часовага ўрада заставаўся Зімні палац. Яго вырашана было атакаваць. Чакалі падыходу маракоў.

Пакуль падыходзілі атрады, у Петраградзе ў дзве гадзіны 5 мінут адкрылася надзвычайнае пасяджэнне Совета. На гэтым пасяджэнні ў сваёй прамове Ленін гаварыў:

«З гэтага часу наступае новая паласа ў гісторыі Расіі, і даная трэцяя руская рэволюцыя павінна ў сваім канечным выніку прывесці к перамозе сацыялізма». (Ленін, творы, т. XXII, стар. 4).

Пасяджэнне Совета толькі паспела закончыцца. Паявіліся караблі з Фінляндыі. Блакада Зімняга палаца была завершана.

Ленін загадаў узяць Зімні прыступам. Сталі рыхтавацца да атакі: меркавалася, што на Петрапаўлаўскай крэпасці ўзнімецца чырвоны флаг, а «Аўрора» павінна даць выстрал з гарматы. Гэта павінна было быць сігналам атакі Зімняга палаца. Ураду быў прад'яўлен ультыматум аб здачы. Урад маўчаў. Тады ў 9 гадзін вечара быў дан гарматны выстрал з «Аўроры». На Зімняму палацу адкрылі агонь гарматы Петрапаўлаўскай крэпасці. Чырвонагвардзейцы кінуліся ў атаку. Адзін атрад чырвоных уварваўся ў палац, але ён быў разбброен юнкерамі. Гэта не ўнесла замяшання ў рады чырвоных атрадаў. Чырвонагвардзейцы з боем займалі паверх за паверхам. Міністры былі арыштаваны і накіраваны ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Вестка аб узяцці Зімняга палаца была перадана ў Смольны. II з'езд Советаў гэта паведамленне сустрэў бурнымі авацыямі.

VI

Увечары 26 кастрычніка на з'ездзе паявіўся Ленін. Дэлегаты з вялікім натхненнем сустрэлі свайго правадыра. Яны віталі ў асобе Леніна перамогшую рэволюцыю. Ленін зачытаў дэкрэт аб міру. Другі раз Ленін выступіў у гэты дзень з дэкрэтам аб зямлі, па якому больш 150 мільёнаў гектараў былых памешчыцкіх, казённых і манастырскіх земляў было перадана працоўнаму сялянству. На з'ездзе быў створан першы ў свеце рабоча-сялянскі ўрад. Старшынёй Соўнаркома быў выбран Ленін, а старшынёй па справах нацыянальнасцей—Сталін.

Керэнскі з кавалерыйскім корпусам Краснова набліжаўся да Петраграда, каб захапіць рэволюцыйную сталіцу. У самім Петраградзе 29 кастрычніка контррэволюцыя пачала паўстанне. Чырвонагвардзейцы, маракі і салдаты быстра разграмілі паўстанне. Пад Петраградам чырвоныя атрады падавілі бунт Керэнскага і генерала Краснова. Красноў быў узят у палон, Керэнскі ўцёк.

VII

У Маскве даведаліся аб паўстанні 25 кастрычніка. Хутка быў створан Ваенна-рэволюцыйны камітэт. Большэвіцкія атрады занялі пошту, тэлеграф і Крэмль. Аднак тут барацьба працякала ў некалькі іншых умовах. Там было не менш 15 тысяч юнкераў і афіцэраў. Камандуючы ўрадавымі войскамі палкоўнік Рабцаў выклікаў дадаткова войска з фронта. 26 кастрычніка юнкеры акружылі Крэмль.

Палкоўнік Рабцаў пачаў перагаворы з паўстанцамі. Ваенна-рэволюцыйны камітэт, у саставе якога былі здраднікі, замест рашучага наступлення на ворага ўступіў з ім у перагаворы. Ворагу неабходна было толькі выйграць час. Раніцой 28 кастрычніка ў Крэмль былі пасланы юнкеры. Рабцаў абмануў паўстаўшых салдат. Ён паведаміў, што ў горадзе ўся ўлада знаходзіцца ў руках буржуазнага ўрада і патрабаваў здаць яму Крэмль. Салдаты паверылі Рабцаву і адчынілі вароты Крэмля. Юнкеры раззброілі большэвіцкія атрады і адкрылі стральбу па безбаронных салдатах.

Аб расстрэле большэвіцкіх салдат быстра даведаліся рабочыя. Днём 28 кастрычніка на фабрыках і заводах прыпынілася работа. Рабочыя ўступілі ў атрады Чырвонай гвардыі. Загулі трывожныя гудкі. З усіх раёнаў Масквы рушыліся рабочыя атрады. Ішла падрыхтоўка да захвату Крэмля. У руках паўстаўшых рабочых былі ўсе вакзалы. Была ўстаноўлена артылерыя. Баі працягваліся 7 дзён. На дапамогу рабочым Масквы падыходзілі атрады рабочых з Іванава-Вазнясенска і іншых гарадоў. 2 лістапада юнкеры здаліся, і Масква стала совецкай.

9 лістапада ўсе палкі атрымалі радыёграму Леніна:

«Салдаты! Справа міру ў вашых руках». У адказ на гэта салдаты арыштоўвалі генералаў і выбіралі на іх месца сваіх камандзіраў. 20 лістапада чырвоныя занялі стаўку. Мільёны салдат на фронце сталі на бок больш вікоў.

VIII

На Украіне пасля Лютаўскай рэволюцыі была створана буржуазная Цэнтральная рада. На чале рады сталі ўкраінскія буржуазныя інтэлігенты, меншавікі і эсэры. Украінская буржуазія і кулацтва не хацелі дзяліцца багаццямі краіны з рускімі і польскімі капіталістамі і памешчыкамі. Рада прасіла Керэнскага прадаставіць Украіне абласную аўтаномію і даць згоду на стварэнне свайго буржуазнага ўрада. Урад Керэнскага адмовіў Цэнтральнай радзе і ў гэтых нязначных патрабаваннях. За поўнае сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне Украіны выступілі толькі рабочыя і сяляне Украіны і Расіі.

Аб паўстанні петраградскіх рабочых у Кіеве даведаліся 25 кастрычніка. Рабочыя Кіева з радасцю сустрэлі гэтае паведамленне. 27 кастрычніка быў створан рэволюцыйны камітэт. Контррэволюцыя прымала тэрміновыя меры. На загаду штаба кіеўскай ваеннай акругі 28 кастрычніка юнкеры акружылі будынак Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і арыштавалі членаў рэволюцыйнага камітэта.

На свабодзе астаўся толькі адзін член раўкома рабочы арсенала Іваноў. Ён стварыў новы рэволюцыйны камітэт.

29 кастрычніка ў Кіеве пачаліся баі. На баку большэвікоў выступіла цяжкая артылерыя. Артылерысты абстралялі Нікалаеўскае і Аляксееўскае юнкерскія вучылішчы і прымусілі іх здацца.

31 кастрычніка рабочыя атрымалі перамогу. Штаб ваеннай акругі ўцёк. У гэты час выступіла Цэнтральная рада і захапіла ўладу ў свае рукі. Рада вяла барацьбу з большэвікамі. Яна стварала армію для барацьбы з Совецкай Расіяй.

Рада пратрымалася ва ўладзе нядоўга. Украінскія рабочыя і сяляне працягвалі барацьбу. На дапамогу ім пашлі рэволюцыйныя атрады з Петраграда і Масквы.

27 студзеня 1918 года ў Кіеў уступілі совецкія войскі. Рэволюцыя перамагла на ўсёй Украіне.

IX

Праз усю Беларусь праходзіў Заходні фронт. Большэвікі ўдзялялі многа ўвагі рабоце сярод салдат. Многа салдат за рэволюцыйную дзейнасць было арыштавана. З арыштаваных салдат большэвікі зарганізавалі полк. У мінскай турме салдаты былі разбіты па ротах.

25 кастрычніка ў Мінску стала вядома аб паўстанні ў Петраградзе. Мінскі Совет зараз-жа аб'явіў сябе ўладай. З арыштаваных салдат быў створан «першы рэволюцыйны полк імені Мінскага Совета».

1 лістапада к Мінску падышлі новыя рэволюцыйныя часці. У Мінску 2 лістапада совецкая ўлада ўстанавілася ўжо трывала.

Большэвікі прыкладалі намаганні к таму, каб не прапускаць адпраўляемыя з фронта часці ў рэволюцыйныя цэнтры: Петраград і Маскву. У Гомелі на чале большэвікоў знаходзіўся Лазар Майсеевіч Кагановіч. Пад кіраўніцтвам тав. Кагановіча большэвікі ўстанавілі кантроль над прасоўваннем войск. Яны сачылі за тым, каб ні адзін эшалон не прайшоў на дапамогу контррэволюцыі. Так-ж кантроль быў устаноўлен большэвікамі ў Оршы і Віцебску.

1 лістапада ў Віцебску быў разброен казачы полк, які спяшаўся на дапамогу Керэнскаму.

Да сярэдзіны лістапада ў гарадах Беларусі былі выбраны новыя большэвіцкія Советы. У вёсках былі створаны сельскія Советы.

20 лістапада ў Мінску адбыўся 2 франтавы з'езд. На гэтым з'ездзе з 700 дэлегатаў каля 500 былі большэвікі і спачуваючыя ім. Старшынёй з'езда быў выбран А. Ф. Мяснікоў, адзін з кіраўнікоў большэвікоў Беларусі. У рабоце з'езда прымалі ўдзел тт. Орджанікідзе і Валадарскі. Яны былі прадстаўнікамі Цэнтральнага Камітэта большэвікоў. З'езд аб'явіў Беларусь совецкай.

X

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя перамагла. «Кастрычніцкая рэволюцыя мела перад сабою такога, параўнальна слабага, дрэнна арганізаванага, палітычна малавопытнага ворага, як руская буржуазія. Не ўзмацнеўшая яшчэ эканамічна і цалкам залежачая ад урадавых заказаў, руская буржуазія не мела ні палітычнай самастойнасці, ні дастатковай ініцыятывы, неабходнай для таго, каб знайсці выхад са становішча. У яе не было ні вопыту палітычных камбінацый і палітычнага ашуканства ў вялікім маштабе, які мае, напрыклад, французская буржуазія, ні школы машэнніцкіх кампрамісаў вялікага размаху, якую мае, напрыклад, англійская буржуазія». («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», стар. 202).

На чале-ж рэволюцыі ішоў рэволюцыйны рабочы клас Расіі. У саюзе з рабочым класам выступала сялянства. Рабочых падтрымлівала сялянская беднага. Партыя большэвікоў сумела згуртаваць працоўных вакол пролетарыята, падняць іх на барацьбу і зламіць супраціўленне ворагаў. Міжнародная буржуазія была занята вайной і яна не магла хутка аказаць неабходнай дапамогі рускай контррэволюцыі. Міжнародны-ж пролетарыят стаяў на баку рэволюцыі.

Пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна Кастрычніцкая рэволюцыя перамагла.

Т. Гладзікаў,
лектар Беластоцкага абкома КП(б)Б.

*). Працяг. Пачатак у нумарах ад 24 і 30 кастрычніка.

Росквіт мастацкай самадзейнасці

Роўна год існуе ў Беластоку абласны дом народнай творчасці. За гэты перыяд зроблена многае па выяўленню і вырашчванню кадраў народнай мастацкай самадзейнасці, па арганізацыі калектываў і ўзняццю іх мастацкага ўзроўню.

Народнае мастацтва, якое было пад спудам, якое бязлітасна душылася і праследвалася ў панскай Польшчы, зараз вышла на светлы шлях росту і закрасавала ўсімі колерамі радугі. З гушчы народа вылучаюцца таленавітыя спевакі і танцоры, артысты і музыканты. Радасная песня свабодна гучыць над вызваленай зямлёй.

Калектывы мастацкай самадзейнасці ўзніклі і плённа працуюць на фабрыках і прадпрыемствах, ва ўстановах, пры дамах соцыялістычнай культуры, у калгасах і вёсках. Усяго ў вобласці створана 205 самадзейных калектываў, сярод якіх 80 драматычных, 65 харавых, 20 духавых, 25 струнных, 15 танцавальных. Мастацкая самадзейнасць становіцца ўсё больш масавай.

Адмена аплаты кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці адыграла вялікую станоўчую ролю. Да кіраўніцтва гурткамі прышлі людзі, якія сапраўды любяць мастацтва, якія жадаюць беззаветна служыць яму не за грошы. Ужо зараз вылучылася нямала актыўных грамадчыкаў, таленавітых мастацкіх кіраўнікоў-самародкаў (шклодуў тав. Сегаловіч — рэжысёр драмгуртка беластоцкага шклозавода, чарцёжнік тав. Носаў з 7-га супраслеўскага тэкстыльнага камбіната, тав. Елец— кіраўнік бельскага хора, тав. Юдзік з 3-га тэкстыльнага камбіната і дзесяткі іншых). Выйграў і мастацкі ўзровень самадзейнасці, якая стала больш свежай, ініцыятыўнай, самадзейнасцю ў поўным сэнсе слова.

Дом народнай творчасці рыхтуе зараз кадры кіраўнікоў драмкалектываў. На трохмесячных курсах з адрывам ад вытворчасці займаецца больш 30 чалавек — людзі, якія ўжо праявілі арганізатарскія і мастацкія здольнасці: Ляўковіч і Казанін (29 фабрыка), Розенберт (1-ы камбінат), Суд (8-ы васількоўскі тэкстыльны камбінат), Судобічаў (3-я вячэрняя школа) і т. д. На курсах выкладаецца мастацтвазнаўства, гісторыя тэатра, рэжысура, работа з акторамі, работа над развіццём мовы і т. д.

Акрамя гэтага 7 беластоцкіх таварышоў навучаюцца на музыкальных курсах у Пінску. Трое скончылі на выдатна танцавальныя курсы ў Вілейцы.

Падрыхтоўка кваліфікаваных кіраўнікоў гурткоў дазволіць узняць нашу мастацкую самадзейнасць на яшчэ вышэйшую ступень.

Сярод драматычных калектываў нашай вобласці зараз наглядаецца вялікі творчы ўздым. 40 драмкалектываў уключыліся ў падрыхтоўку да ўсесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці. Паспяхова праходзіць работа ў беластоцкіх драмкалектывах шклозавода, 3-га тэкстыльнага камбіната. Апошні рыхтуе інсцэніроўку кнігі Ванды Васілеўскай «Воблік дня».

Драмгуртрок старасельцаўскага чыгуначнага клуба рыхтуе пастаноўку п'есы Эд. Самуйлёнка «Пагібель воўка». Агульнагарадскі гродненскі драмкалектыў будзе ўдзельнічаць ва ўсесаюзным аглядзе спектаклем «Без віны вінаватыя»—Астроўскага. Мала-бераставіцкі драмгурток ставіць п'есу на беларускай мове «На варце». Драмкалектыў Аўгустоўскага дома соцкультуры падрыхтаваў некалькі аднаактных п'ес, сярод якіх асабліва вылучаецца «У лесе» — Малчанава.

Пры Снядаўскім доме соцкультуры паспяхова рыхтуюцца да агляду тры драмкалектывы (рускі, польскі і яўрэйскі). На польскай мове будзе пастаўлена «Карчма на румынскай граніцы» — Шатровых.

З вялікім поспехам паставі п'есу Ульянінскага «На полустан ку» супраслеўскі драмкалектыў. Д гадавіны Кастрычніка тут рыхтуе ца новая пастаноўка. Аднак трэ адзначыць, што дырэкцыя 7-г тэкстыльнага камбіната не стварыл належных умоў для работы драм калектыва. Нават няма дзе рэпеты раваць. Чырвоны куток, які ран быў на камбінаце, адведзен пад і тэрнат.

У сувязі з усесаюзным агляд тэатральнай самадзейнасці р п'ес совецкіх драматургаў перакл дзены на польскую мову. Аднак н дахоп п'ес на польскай мове яш адчувальны. Зусім няма арыгінал ных польскіх п'ес на совецкую матыку.

Буйным недахопам у падрыхт цы да ўсесаюзнага агляду з'яў ецца тое, што ў рэпертуары ам зусім няма п'ес на беларускай м Нават п'еса «Пагібель воўка» дзе ставіцца ў перакладзе на кую мову. Гэту памылку неабх будзе выправіць.

Няма сумнення, што ўсесаю агляд тэатральнай самадзей з'явіцца стымулам да далей росту нашага самадзейнага ма тва.

Т. Лясов

ГРЭЧАСКАЕ КАМЮНІКЕ АБ ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯХ У ГРЭЦЫІ

АФІНЫ, 4 лістапада. (ТАСС). Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва апублікавала камюніке грэчаскага міністэрства дзяржаўнай бяспечнасці, у якім гаворыцца, што на працягу 2 лістапада італьянскія самалёты зрабілі некалькі налётаў на розныя грэчаскія гарады. На Патры і яго ваколіцы было зроблена 2 паветраных напады. Колькасць афяр бамбардыроўкі нязначная. Пашкоджана некалькі будынкаў. На Салонікі зроблена 2 налёты, ёсць значныя афяры сярод грамадзянскага насельніцтва. Прычынены значныя разбурэнні. Адзін самалёт працівіка збіт у ваколіцах Салонік. Два налёты было зроблена на востраў Корфу, дзе маюцца афяры сярод грамадзянскага насельніцтва.

Тры налёты былі зроблены на Яніну. Пры гэтым былі збіты два італьянскіх самалёты. Двукратнаму налёту падвергся таксама востраў Крыт. Акрамя таго, італьянская авіяцыя зрабіла налёты на 10 іншых гарадоў і вёсак Грэцыі. Пры гэтых налётах ні адзін грэчаскі ваенны аб'ект не пацярпеў.

—о—

Зводка Італьянскага камандавання

РЫМ, 4 лістапада. (ТАСС). Італьянскае камандаванне паведамляе, што ў раёне Эпіра працягваюць дзеянні італьянскіх часцей, якія занялі Калібака і прасоўваюцца далей. Італьянская авіяцыя люта бамбардыруе непрыяцельскія пазіцыі ў раёне на ўсход ад Карыцы. Зноў падвергнуты паветранай бамбардыроўцы Салонікі, крэпасць Корфу, марская база Наварын (Пілос) і паўночна-ўсходні склон дарогі, якая вядзе ад Яніны да Калібака. Адзін італьянскі самалёт не вярнуўся. Ва ўчарашнім баі над горадам Салонікі, акрамя аднаго самалёта, аб якім гаварылася ва ўчарашняй зводцы, збіта яшчэ 5 непрыяцельскіх самалётаў.

Сёння ноччу непрыяцельскія самалёты прабавалі бамбардыраваць Неаполь. Яны былі сустрэты агнём зенітнай артылерыі і былі прымушаны скінуць бомбы ў адкрытым полі, дзе забіт адзін чалавек і ранены тры.

—о—

Італьянскае абвяржэнне

БЕРЛІН, 4 лістапада. (ТАСС). Як перадае інфармацыйнае бюро з Рыма, у афіцыяльных кругах Італіі катэгарычна абвяргаецца распаўсюджваемае паведамленне аб тым, што быццам-бы адзін італьянскі самалёт у час налёту на Корфу меў грэчаскія апазнавальныя знакі.

—о—

ВЫСАДКА АНГЛІЙСКІХ ВОЙСК НА ВОСТРАВЕ КРЫТ

ЛОНДАН, 4 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што як было афіцыяльна аб'яўлена ў Лондане, на востраве Крыт высадзілася некаторая колькасць англійскіх войск.

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 4 лістапада. (ТАСС). Германскае камандаванне паведамляе: «Не гледзячы на дрэннае надвор'е, германская авіяцыя працягвала, хаця і ў меншым размеры, рабіць налёты на Лондан і на іншыя важныя ваенныя аб'екты ў Англіі і ў Шатландыі. Германскія самалёты з блізкага палёту атакавалі таварныя станцыі ў паўночнай часткі Лондана, прычыніўшы пашкоджанні будынкам станцыі і чыгуначным збудаванням. На зваротным шляху германскія самалёты абстралялі з кулямётаў і прымусілі замаўчаць некалькі зенітных гармат працівіка. У Стрэтыхоле пашкоджаны ангары і самалёты. Германская авіяцыя паспяхова бамбардыравала таксама аэрадромы і прамысловыя аб'екты ваеннага значэння ў Шатландыі.

Ля Ірландскага ўзбярэжжа і ўсходняга ўзбярэжжа Шатландыі германскія самалёты атакавалі асобныя непрыяцельскія караблі і транспарты. Сур'ёзна быў пашкоджан адзін непрыяцельскі гандлёвы параход танажам у 19 тысяч тон.

Англійскія самалёты зрабілі нямнагалікія налёты на Галандыю і паўночную Германію. У Галандыі разбурана 2 дамы, забіта 2 і ранена некалькі чалавек. У Германіі бомбы былі скінуты толькі ў трох месцах і не прычынілі пашкоджанняў. У чора працівік страціў 3 самалёты. Два германскія самалёты не вярнуліся на базы».

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 4 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора ўдзень адзіночныя германскія самалёты рабілі налёты на рад раёнаў Англіі. У гэтых раёнах скінута невялікая колькасць бомб. Нанесены ўрон нязначны. Збіт адзін германскі бамбардыроўшчык. Англійская авіяцыя страціла адзін самалёт.

У ноч на 4 лістапада, упершыню за працяглы перыяд, у Лондане не было аб'яўлена паветранай трывогі. Невялікая колькасць германскіх самалётаў перасекла ўзбярэжжа Англіі і зрабіла налёт на Паўночна-Усходнюю Англію і Усходнюю Шатландыю.

У ноч на 3 лістапада, у сувязі з неспрыяючымі метэаралагічнымі ўмовамі, англійскія бамбардыроўшчыкі не рабілі налётаў на Германію.

Новыя дэкрэты французскага ўрада

НЬЮ-ЙОРК, 4 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Юнайтад Прэс з Вішы, французскі ўрад апублікаваў дэкрэт аб разгранічэнні інфармацыйнага агенцтва Гавас, які прадастаўляе права ўраду набыць акцыі агенцтва на суму 25 мільёнаў франкаў. Як перадаюць, урад будзе кіраваць дзейнасцю гэтага агенцтва. Апублікаван таксама дэкрэт урада аб забароне прыёму англійскіх радыёперадач, а таксама перадач радыёстанцый, якія працягваюць французскую «антынацыянальную» прапаганду. Згодна гэтага дэкрэта за слуханне такіх перадач у грамадскіх месцах налагаецца штраф ад 16 да 1.000 франкаў. Акрамя таго, асобы, вінаватыя ў парушэнні гэтага дэкрэта, падлягаюць заключэнню ў турму тэрмінам ад 6 дзён да 6 месяцаў, а радыёпрыёмнікі будуць канфіскаваны.

Новы закон ва Францыі

БЕРЛІН, 4 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Жэневы, што згодна афіцыяльна апублікаванаму ва Францыі дэкрэту, пакаранне за зневажанне главы дзяржавы, прадугледжанае ў параграфе 26 «Аб свабодзе друку», цяпер павышаецца. У далейшым зневажэнне главы дзяржавы будзе карацца турэмным зняволеннем ад 2 месяцаў да 3 год або штрафам ад 1.000 да 30.000 франкаў, ці тым і другім разам.

НОВЫЯ МЕРЫ КАНТРОЛЮ НАД ПРЭСАЙ У БАЛГАРЫІ

БЕРЛІН, 4 лістапада. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро з Сафіі, на падставе закона аб мабілізацыі грамадзянскага насельніцтва пры ваенным міністэрстве Балгарыі створана ўпраўленне па справах прапаганды. Гэта ўпраўленне павінна ажыццяўляць кантроль над прэсай, радыё, кінофільмамі і інш.

„Шанхай Майніці" аб мірных прапановах Японіі

ШАНХАЙ, 4 лістапада. (ТАСС). Выходзячая ў Шанхаі японская газета «Шанхай Майніці» пісала ва ўчарашняй перадавой: «24 кастрычніка знаходзячыяся ў Чунцыне паслы Германіі, Італіі і Францыі звярнуліся да кітайскага ўрада з прапановай заключыць мір з Японіяй. Адначасова з гэтым кітайскі пасол у Амерыцы атрымаў ад амерыканскага ўрада ўведамленне аб тым, што міркуемая пазыка Чунцыну не будзе прадастаўлена ў сувязі з мірнымі планамі кітайскага ўрада. Далей газета ўказвае, што замежным дыпламатам не ўдалося схіліць чунцынскі ўрад да заключэння міру з Японіяй. Прычына няўдачы, па думцы газеты, заключаецца ў тым, што паміж замежнымі дыпламатамі, з аднаго боку, і настроенай у карысць міру фракцыяй кітайскага ўрада, з другога боку, не было адзінства».

«У сувязі з апошнімі поспехамі японскіх войск на франтах і ўзмацніўшыміся спробамі Амерыкі запалохаць Японію, —гаворыцца далей у артыкуле, — наш урад павінен заявіць аб поўным спыненні размоў аб міру, адначасова падкрэсліўшы сваю рашымасць дасягнуць пастаўленых мэт іншымі сродкамі».

У НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯЦЕ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ

29 кастрычніка англійскі пасол у Маскве п. Крыпс звярнуўся да Народнага Камісара Замежных Спраў тав. Молатава з нотай, у якой Брытанскі Урад выражаў свой пратэст супроць прынятага Урадам СССР рашэння аб неабходнасці арганізацыі новай (унітарнай) Дунайскай Камісіі і ўдзелу прадстаўнікоў СССР у перагаворах з прадстаўнікамі Германіі, Італіі і Румыніі ў г. Бухарэсце. Разглядаючы дзеянні Савецкага Ўрада як парушэнне ім нейтралітэта, Брытанскі ўрад заявіў, што ён не можа прыняць якія-б та не было Пагадненні, якія могуць парушыць існуючыя дагаворы і што ён павінен захаваць усе свае правы, звязаныя з гэтым пытаннем.

2 лістапада Намеснік Народнага Камісара Замежных Спраў тав. Вышынскі прыняў англійскага пасла п. Крыпса і ўручыў яму ад імені Савецкага Ўрада ноту, у якой Урад СССР заяўляе, што ён вымушан прызнаць няправільным сцвярджэнне Брытанскага Ўрада аб тым, што прызнанне Савецкім Урадам неабходнасці стварэння новай Дунайскай Камісіі і ўдзел СССР у перагаворах у г. Бухарэсце з'яўляецца парушэннем нейтралітэта.

Стварэнне Дунайскай Камісіі з удзелам СССР, а таксама дзяржаў, размешчаных па Дунаю ці блізка к Дунаю з'яўляецца аднаўленнем справядлівасці, парушанай Версальскім і іншымі дагаворамі, у сілу якіх, пры кіруючай ролі Брытанскага ўрада, СССР быў адхілен з састава як Міжнароднай, так і Еўрапейскай Дунайскіх Камісій.

Дунайская Камісія, натуральна, павінна быць састаўлена з прадстаўнікоў дзяржаў, размешчаных па Дунаю ці блізка звязаных з Дунаем і выкарыстаючых Дунаем як канал для тавараабароту (напрыклад, Італія).

Зразумела, што Вялікабрытанія, аддалёная ад Дуная на тысячы кіламетраў, не можа быць аднесена да ліку такіх дзяржаў.

Зразумела таксама, што пытанне аб саставе Дунайскай Камісіі не мае ніякіх адносін да пытання аб нейтралітэце.

З прычыны выкладзенага, Савецкі Урад не можа прыняць пратэст, заяўлены Брытанскім Урадам у ноце ад 29 кастрычніка.


ЗАЯВА ЎРАДА ЯПОНІІ ГРЭЧАСКАМУ ЎРАДУ

ЛОНДАН, 4 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, японскі ўрад заверыў урад Грэцыі ў тым, што грэчаскія судны, якія накіроўваюцца ў Японію, змогуць свабодна пакінуць порты пасля разгрузкі. Гэта заяўленне паследавала у сувязі з заявай грэчаскага ўрада аб тым, што ўсе грэчаскія судны, якія знаходзяцца на шляху ў Японію, атрымалі ўказанне працягваць свой шлях.

—о—

МЕРАПРЫЕМСТВЫ ГРЭЧАСКАГА ЎРАДА

АФІНЫ, 4 лістапада. (ТАСС). Метаксас звярнуўся да насельніцтва з адозвай аб узмацненні збору ахвяраванняў у карысць фронта. Створана спецыяльная камісія па збору ахвяраванняў пад старшынствам міністра ўнутраных спраў.



Лекцыя фізікі ў 7-ым класе польскай школы (г. Аўгустоў). На здымку: настаўнік тав. М. Г. Сяргееў праводзіць вопыты.

Фота А. Сапіра.

Афармленне горада ў дні свята

Да ўрачыстага дня 7-га лістапада Беласток прыме святочны выгляд. Савецкая плошча будзе афармлена на тэму «Прывітанне вялікаму Сталіну». Будынак горвыканкома упрыгожваецца партрэтамі, двума пано, эмблемамі і флагамі.

На тэму «Дасягненні савецкай улады за 23 годы» будуць афармлены фасады будынкаў арганізацый і ўстаноў, размешчаных па вуліцах Савецкай і Ленінскай. На цэнтральных вуліцах горада будуць развешаны лозунгі.

Над тэхнічным афармленнем горада працуе зараз 25 чалавек. Лепшымі мастакамі Беластока зроблены партрэты і пано.

6 лістапада афармленне і ўпрыгожванне горада будуць закончаны.

Падрыхтоўка школ да свята

У школах, дзіцячых дамах, дзіцячых садах Беластока ідзе дзейная падрыхтоўка да свята—XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Усюды праводзяцца гутаркі, чыткі, лекцыі аб Вялікім Кастрычніку і аб дасягненнях савецкай улады за 23 годы. Падрыхтоўваецца выпуск насценгазет, прысвечаных слаўнай гадавіне. Падводзяцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж класамі і асобнымі вучнямі.

У 1-й сярэдняй польскай школе паспяхова шырыцца перадкастрычніцкае спаборніцтва, узрасла паспяховасць вучняў. Дзейна рыхтуецца да свята школьная мастацкая самадзейнасць. На вечарах, прысвечаных святу, вучні пакажуць рад цікавых гімнастычных і танцавальных нумароў. Вучні 8-й сярэдняй рускай школы рыхтуюць пастаноўку аднаго акта з камедыі Фанвізіна «Недарасль». Цікавую фота-выстаўку на тэмы «Дзеці ў капіталістычных краінах», «Клопаты аб дзецях у краіне сацыялізма», «Будаўніцтва новага жыцця ў Савецкім Саюзе» падрыхтоўвае да свята 25-я яўрэйская школа. Выстаўка будзе складацца з 200 экспанатаў.

ПОМНІК В. І. ЛЕНІНУ Ў САКОЛЦЫ

Да дня XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў скверы горада Саколка будзе ўстаноўлен помнік В. І. Леніну. Ужо загатоўлены ўсе матэрыялы. Помнік будзе мець больш трох метраў у вышыню.

Нарада работнікаў бібліятэк

У беластоцкім Доме настаўніка праведзена нарада бібліятэчных работнікаў горада, на якой абмеркаваны мерапрыемствы па рабоце з чытачамі ў дні гадавіны Вялікага Кастрычніка, а таксама ў сувязі з юбілеем Адама Міцкевіча і выбарамі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

У абласной бібліятэцы ўжо наладжана выстаўка кніг, прысвечаная Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Рыхтуецца выстаўка да юбілея Міцкевіча.

Нарада рашыла практыкаваць гронкія чыткі з наступаючай гутаркай, саставіць рэкамендацыйныя спіскі кніг у сувязі з выбарчай кампаніяй, выпусціць насценгазеты, прысвечаныя выбарам, і т. д.

М. Лахціна.

Будаўніцтва новага радыёвузла

У раённым цэнтры—гор. Саколка заканчваецца будаўніцтва новага радыёвузла, які дасць магчымасць радыёфіцыраваць населеныя пункты раёна. Будзе ўстаноўлена больш 500 радыёкропак.

Першыя радыёперадачы будуць транслявацца ў дзень XXIII гадавіны Кастрычніка.

АРКЕСТР НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ У БЕЛАСТОКУ

Пры беластоцкім доме народнай творчасці арганізуецца аркестр народных інструментаў, у якім будзе занята 24 чалавекі. Ужо закуплен камплект інструментаў. Распачата ўкамплектаванне аркестра музыкантамі.

Нам. адказнага рэдактара Г. М. КУЗНЯЦОЎ.